**ДЫПЛОМНАЯ ПРАЦА** – заключная праца вучэбна-даследчага характару, якую выконваюць студэнты пры заканчэнні вышэйшай навучальнай установы. Абараняецца на пасяджэнні дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі.

Да дыпломнай працы па методыцы выкладання літаратуры прад'яўдяюцца наступныя патрабаванні:

– тэма дыпломнага даследавання павінна быць актуальнай, вырашаць значныя метадычныя задачы;

– усе тэарэтычныя і эксперыментальныя вывады павінны быць абгрунтаваны, правераны на практыцы ў школе і мець элементы навізны;

– апрацоўку вынікаў метадычнага эксперымента неабходна выконваць на аснове статыстычных метадаў;

– У дыпломнай працы студэнт павінен выявіць высокі ўзровень уласнай педагагічнай і навуковай культуры, свае творчыя здольнасці, глыбокія веды, уменні і навыкі.

Структурнымі часткамі дыпломнай працы па методыцы выкладання літаратуры з'яўляюцца тытульны ліст, змест, уступ, асноўная частка, заключэнне, спіс выкарыстанай літаратуры, дадаткі.

Ва ўводзінах даецца абгрунтаванне выбару тэмы і яе актуальнасць, фармулюецца мэта і задачы даследавання, вызначаюцца яго аб'ект і прадмет, паказваюцца метадалагічныя асновы і метады, з дапамогаю якіх будуць вырашацца пастаўленыя задачы.

У асноўнай частцы дыпломнай працы (у раздзелах) неабходна лагічна і абгрунтавана выкласці матэрыял, методыку даследавання, вынікі. Кожны раздзел абавязкова заканчваецца вывадамі.

Зместам заключэння з'яўляюцца асноўныя вынікі даследавання і зробленыя на іх аснове вывады.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ